**23.** Хто з вядомых дзеячаў з’яўляецца аўтарам працы “Беларусы”, прысвечанай беларускай мове, літаратуры і народнай творчасці з XIII да 1-й чвэрці XX стагоддзя ўключна?

**А)** Я. Ф. Карскі. **Б)** М. І. Гарэцкі. **В)** У. М. Дабравольскі.
**Г)** І. Я. Лепешаў. **Д)** Я. Ю. Лёсік.

---

**24.** Назва гэтай субкультуры канца 1940-х – пачатку 1960-х гадоў пайшла ад назвы фельетона Д. Бяляева ў сатырычным часопісе “Кракадзіл” (№7, 1949). Што гэта за назва?

**А)** хіпі. **Б)** хіпстары. **В)** стылягі. **Г)** клікбэйт. **Д)** фактчэкінг.

---

**25.** Хто з'яўляецца аўтарам вершаваных радкоў?

*Мой родны Мінск,*
*Пад небам жураўліным*
*Жыві, квітней пад зоркай залатой…*

**А)** Н. Гілевіч. **Б)** П. Панчанка. **В)** М. Танк. **Г)** В. Зуёнак. **Д)** Г. Бураўкін.

---

**26.** «Наш Дастаеўскі» гаварылі пра… .

**А)** Змітрака Бядулю. **Б)** Барыса Сачанку. **В)** Івана Чыгрынава.
**Г)** Уладзіміра Караткевіча. **Д)** Кузьму Чорнага.

---

**27.** Гэта слова паходзіць ад назвы вострай палачкі, якая ўжывалася ў Старажытнай Грэцыі і Старажытным Рыме. У тыя часы людзі пісалі на дошчачках, залітых воскам. Вострым канцом палачкі выводзілі літары, а тупым выпраўлялі, загладжвалі напісанае. Якое слова маецца на ўвазе?

**А)** аловак. **Б)** ручка. **В)** пяро. Г) стыль. **Д)** пэндзаль.

---

**28.** Адзін з вершаў Янкі Купалы мае назву “Аўтарцы “Скрыпкі беларускай”. Каму паэт прысвяціў свой твор?

**А)** Алаізе Пашкевіч. **Б)** Паўліне Мядзёлцы. **В)** Лідзіі Мухарынскай.
**Г)** Канстанцыі Буйло. **Д)** Марыі Канапніцкай.

---

**29.** Гэта княгіня паходзіла з даўняга роду князёў Вішнявецкіх. Стаўшы жонкаю гетмана Міхаіла Казіміра Радзівіла Рыбанькі, яна клапацілася пра архіў і бібліятэку, папрасіла мужа зноў адчыніць друкарню. Для будучага тэатра сама пачала пісаць творы. У сваёй літаратурнай спадчыне акрамя камедый і трагедый пакінула вершы і творы для дзяцей.

Як звалі княгіню?

**А)** Уршуля Францішка. **Б)** Сафія. **В)** Рагнеда. **Г)** Анастасія. **Д)** Барбара.

---

**30.** Хто з мастакоў слова ўвёў паняцце «страчанае пакаленне» ў сусветны літаратурны ўжытак, выкарыстаўшы словы *«Усе вы – страчанае пакаленне»* ў якасці аднаго з двух эпіграфаў да рамана «І ўзыходзіць сонца (Фіеста)»?

**А)** Г. Бёль. **Б)** Э. Хемінгуэй. **В)** Э. Ажэшка. **Г)** М. Зарэцкі. **Д)** К. Чорны.

---

Арганізатар гульні-конкурсу «Буслік» –
Грамадскае аб’яднанне «Беларуская асацыяцыя «Конкурс»
220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 375 66 17, 375 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by https://bakonkurs.by/ https://конкурс.бел/
ГА «БА «Конкурс». Заказ 16. Тыраж 11400 экз. г. Мінск. 2020 г.

# Гульня-конкурс па беларускай мове і літаратуры
# «БУСЛІК-2020»

*Чацвер, 20 лютага 2020 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- за няправільны адказ аднімаецца чвэрць балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі, у заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай і электроннымі сродкамі забараняецца;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу; пры парушэнні гэтых патрабаванняў удзельнікі могуць быць дыскваліфікаваны;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце https://bakonkurs.by/ праз 1–2 месяцы пасля правядзення конкурсу.

---

## Заданне для вучняў 10-11 класаў

**1.** Мабыць, з дзяцінства кожнаму помняцца словы песенькі-забаўлянкі:

*Лады-лады-ладкі,* *– Што елі?*
*– Дзе былі?* – … .
*– У бабкі.*

Якое слова прапушчана?

**А)** аладку. **Б)** булку. **В)** зацірку. **Г)** кашку. **Д)** манку.

---

**2.** Выберыце з прапанаваных правільна напісаныя словы.

*1) фае; 2) аксіома; 3) іонны; 4) пантэон.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**3.** Колькі ўсяго слоў, у якіх ёсць санорныя зычныя, ужыта ў выслоўі?

*З мора вады не выліць, з песні слова не выкінуць.*

**А)** 0. **Б)** 4. **В)** 6. **Г)** 8. **Д)** 10.

---

**4.** Юрась, запісваючы сказ, задумаўся над знакам прыпынку на месцы пропуску. Які знак прыпынку патрэбна паставіць?

*Пра Талачын вядомы цікавы гістарычны факт_ адыходзячы з Масквы ў лістападзе 1812 года, Напалеон Банапарт загадаў тут спаліць сцягі сваіх палкоў.*

**А)** знак прыпынку не патрэбен. **Б)** коску. **В)** двукроп’е.
**Г)** кропку з коскай. **Д)** працяжнік.

**5.** *Бяссэнсавы, незразумелы набор слоў – ... .*
**А)** абракадабра. **Б)** абра-кадабра. **В)** абра кадабра. **Г)** а бракадабра. **Д)** а-бракадабра.

---

**6.** Якія з дадзеных зычных гукаў у пазіцыі паміж галоснымі вымаўляюцца падоўжана?
*1) [ш]; 2) [з']; 3) [ч]; 4) [ц']; 5) [ж]; 6) [с'].*
**А)** усе гукі. **Б)** 1, 3, 5. **В)** 2, 4, 6. **Г)** 3, 6. **Д)** 4, 5.

---

**7.** У якім годзе ўпершыню з'явілася трактоўка слова ***камп'ютар*** у Оксфардскім слоўніку англійскай мовы?
**А)** у 1897. **Б)** у 1900. **В)** у 1947. **Г)** у 1975. **Д)** у 1995.

---

**8.** Стала ўжо традыцыяй, што да вяселля гатуюць абрадавае печыва, якое сімвалізуе багацце, дабрабыт будучай сям'і, атаясамліваецца з маладымі, іх шчасцем і доляй. Гэта – … .
**А)** пернікі. **Б)** мачанка з блінамі. **В)** каравай. **Г)** булка. **Д)** пячэнне.

---

**9.** Лагічная аперацыя, якая ўтварае складанае выказванне шляхам аб'яднання двух выказванняў пры дапамозе лагічнага злучніка «або», называецца … .
**А)** дыз'юнкцыя. **Б)** дэз'юнкцыя. **В)** дызункцыя. **Г)** даз'юнкцыя. **Д)** дэзункцыя.

---

**10.** Месца на беразе ракі, куды звозяць бярвенне для сплаву і дзе вяжуць плыты, у народзе называюць … .
**А)** рулон. **Б)** рум. **В)** румза. **Г)** румб. **Д)** руль.

---

**11.** Дадзены назвы экзатычных жывёл: *1) грызлі; 2) кенгуру; 3) шымпанзэ.*
Выберыце назоўнікі мужчынскага роду.
**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**12.** Колькі слоў, у якіх усе зычныя гукі цвёрдыя, ужыта ў сказе?
*Шматгранная плённая дзейнасць Рыгора Раманавіча Шырмы – гэта наша гістарычная спадчына.*
**А)** 0. **Б)** 3. **В)** 4. **Г)** 5. **Д)** 6.

---

**13.** Падбярыце адпаведнік да рускага выслоўя *ремесло не коромысло – плеч не оттянет*.
**А)** што ведаем – кропля, чаго не ведаем – мора. **Б)** пусты млын без ветру меле.
**В)** умельства нікога не абцяжарвае. **Г)** з чыстай крыніцы чыстая вада.
**Д)** спаборніцтва жывіць таленты.

---

**14.** Хто з мастакоў слова з'яўляецца аўтарам слоў: *«У родным краі ёсць крыніца жывой вады…»*?
**А)** Янка Купала. **Б)** Якуб Колас. **В)** Максім Багдановіч.
**Г)** Змітрок Бядуля. **Д)** Цётка.

---

**15.** Выберыце з прапанаваных няправільна напісаныя словы.
*1) перавосчык; 2) заглужка; 3) абрэвіяцыя; 4) памошнік.*
**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**16.** З якімі дзеепрыметнікамі напішаце часціцу ***не*** разам?
*1) (не)дапісаная аўтабіяграфія; 2) (не)прачытаны раман;*
*3) (не)парушнае сяброўства.*
**А)** з усімі. **Б)** няма такіх. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**17.** Суаднясіце назвы і значэнні.
*1) пост; 2) рэпост; 3) клікбэйт.*
а) капіраванне пэўнага запісу да сябе на старонку ў сацыяльнай сетцы;
б) маркетынгавы ход, які выкарыстоўваецца, каб прадаць рэкламу, павысіць наведвальнасць сайта;
в) асобна ўзятае паведамленне ў форуме, сацыяльнай сетцы або блогу.
**А)** 1-а, 2-б, 3-в. **Б)** 1-а, 2-в, 3-б. **В)** 1-в, 2-а, 3-б. **Г)** 1-в, 2-б, 3-а. **Д)** 1-б, 2-а, 3-в.

---

**18.** Выберыце правільныя сцвярджэнні.
Часціца ***не*** мае сцвярджальнае значэнне, калі:
1) ужываецца перад назоўнікам з прыназоўнікам *без*;
2) спалучаецца са словамі *нельга, немагчыма*;
3) пры адмоўным параўнанні.
**А)** усе сцвярджэнні. **Б)** няма правільных сцвярджэнняў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**19.** Якія знакі прыпынку неабходна паставіць на месцы пропускаў у сказе?
*Пётр Ма́ксавіч Явіч _ чые творы знаходзяцца не толькі ў музеях і галерэях Беларусі _ а яшчэ ў Траццякоўскай галерэі_ адзін з апошніх вучняў Юдэля Пэна _ легендарнага віцебскага жывапісца _ які заснаваў у горадзе на Дзвіне адмысловую мастацкую школу.*
**А)** дзве коскі, працяжнік, дзве коскі. **Б)** дзве коскі, двукроп'е, дзве коскі.
**В)** дзве коскі, два працяжнікі, адна коска. **Г)** тры коскі, працяжнік, дзве коскі.
**Д)** пяць косак.

---

**20.** Старажытнагрэчаская літаратура – адна з найвялікшых у чалавечай культуры. Яна дала свету: *а) заснавальніка камедыі; б) заснавальніка драмы; в) байкапісца.*
Вызначце імёны славутасцей: *1) Эзоп; 2) Арыстафан; 3) Сафокл.*
**А)** а-1, б-2, в-3. **Б)** а-1, б-3, в-2. **В)** а-2, б-1, в-3. **Г)** а-2, б-3, в-1. **Д)** а-3, б-1, в-2.

---

**21.** У паэме Якуба Коласа “Новая зямля” ў раздзеле “Раніца ў нядзельку” ёсць радкі:
*…Услон заняў сваё ўжо места,*
*На ім стаяла дзежка цеста,*
*І апалонік то і дзела*
*Па дзежцы боўтаў жвава, смела*
*І кідаў цеста ў скавародкі…*
Якое лексічнае значэнне маюць словы: *а) услон; б) дзежка; в) апалонік*?
Падбярыце правільныя варыянты.
*1) рэч хатняга ўжытку – зацягнутая на шырокі абруч густая сетка для прасейвання мукі і інш.;*
*2) драўляная, крыху звужаная к верху пасудзіна з прамых клёпак для заквашвання цеста і інш.;*
*3) сталовы прыбор у выглядзе ручкі з доўгімі зубамі;*
*4) вялікая лыжка, якой разліваюць вадкую страву;*
*5) крайняя частка якой-небудзь прасторы, край стала, ложка і пад.;*
*6) пераносная лаўка на ножках у сялянскай хаце.*
**А)** а-1, б-4, в-2. **Б)** а-3, б-6, в-5. **В)** а-4, б-3, в-1. **Г)** а-5, б-1, в-3. **Д)** а-6, б-2, в-4.

---

**22.** Дадзены словы на рускай мове: *1) щелок; 2) упряжь; 3) вожжи; 4) сарай.*
Падбярыце адпаведнікі на беларускай мове: *а) лейцы; б) луг; в) хлеў; г) збруя.*
**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **Б)** 1-а, 2-в, 3-г, 4-б. **В)** 1-б, 2-г, 3-а, 4-в.
**Г)** 1-в, 2-а, 3-г, 4-б. **Д)** 1-г, 2-б, 3-в, 4-а.